# ЧАРНОБЫЛЬ. 40 ГАДОЎ ПАСЛЯ АВАРЫІ

*(Бібліяграфічны спіс)*

Аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі (ЧАЭС) стала не толькі найбуйнейшай тэхнагеннай катастрофай XX ст., але і ўрокам усяму чалавецтву, паказаўшы, што ядзерная энергія, якая выйшла з-пад кантролю, не прызнае межаў. 26 красавіка 1986 г. на чацвёртым энергетычным блоку ЧАЭС адбыўся выбух, у выніку якога радыяцыйнае забруджванне закранула значную частку тэрыторыі Беларусі. У зоне радыеактыўнага заражэння апынуліся 2,2 млн чалавек, 3678 населеных пунктаў (479 з іх спынілі існаванне). З пацярпелых тэрыторый былі адселены 137,7 тыс. чалавек, з абароту выведзены вялікія плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў, ліквідаваны калгасы і саўгасы, прадпрыемствы. Уздзеянне чарнобыльскай катастрофы на экалогію паставіла Беларусь перад неабходнасцю вырашэння новых, выключна складаных і буйнамаштабных праблем, якія адносіліся практычна да ўсіх сфер грамадскага жыцця, многіх аспектаў навукі, вытворчасці і культуры. У 1989 г. Вярхоўны Савет БССР прызнаў усю тэрыторыю Беларусі зонай экалагічнага бедства. Былі прыняты значныя меры па вырашэнні радыяцыйна-экалагічных, медыцынскіх, сацыяльна-эканамічных і іншых праблем, звязаных з катастрофай. Асноўным інструментам дзяржаўнай палітыкі ў сферы пераадолення наступстваў чарнобыльскай катастрофы з'яўляюцца дзяржаўныя праграмы. З 1990 г. рэалізавана шэсць. Асноўныя задачы – сацыяльная абарона пацярпелага насельніцтва, забеспячэнне патрабаванняў радыяцыйнай бяспекі, паскоранае сацыяльна-эканамічнае развіццё і адраджэнне забруджаных радыенуклідамі тэрыторый. Вялікі ўклад у іх выкананне ўнеслі праграмы сумеснай дзейнасці па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы ў рамках Саюзнай дзяржавы. З мэтай медыцынскай рэабілітацыі распрацаваны Канцэпцыя арганізацыі медыцынскага забеспячэння насельніцтва, а таксама ўніфікаваныя пратаколы аказання медыцынскай дапамогі дарослым і дзецям. Былі адкрыты новыя медыцынскія ўстановы, інстытуты, спецыялізаваныя клінікі і цэнтры. З 2003 г. у Гомелі дзейнічае Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека, які ажыццяўляе каардынацыю ўсёй работы па спецдыспансерызацыі насельніцтва Беларусі. Праводзіцца санаторна-курортнае лячэнне, створаны дзіцячыя аздараўленчыя цэнтры. Найбольш пацярпелай у выніку аварыі катэгорыі насельніцтва прадастаўляецца шэраг сацыяльных льгот. Пераадоленне наступстваў чарнобыльскай катастрофы з'яўляецца задачай дзяржаўнай значнасці. Пытанні жыццядзейнасці насельніцтва на пацярпелых тэрыторыях знаходзяцца ў цэнтры ўвагі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі, органаў заканадаўчай і выканаўчай улады.

У прапанаваны бібліяграфічны спіс уключаны дакументы з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, выдадзеныя за апошнія 10 гадоў. Больш падрабязная інфармацыя па ўсіх аспектах чарнобыльскай катастрофы і мінімізацыі яе вынікаў змешчана ў бібліяграфічных матэрыялах («Новыя кнігі: па старонках беларускага друку», 2006, № 3 ; 2011, № 2 (дадаткі) ; CD-ROM «Чарнобыль», 2006), адлюстравана ў анлайн-энцыклапедыі «Беларусь: ад мінулага да сучаснага».